пунктаў у іншых рэгіёнах Беларусі, змогуць акрэсліць і іншыя мікраарэалы гаворак з падобнай адметнай рэгіянальнай кансанантнай з'явай, не адзначаныя пры зборы матэрыялаў падчас ранейшых агульнарэспубліканскіх лінгвагеаграфічных даследаванняў.

## Літаратура


1. *Даніловіч, М. А.* Рэгіянальныя моўныя з'явы ў класіфікацыйнай сістэме беларускіх гаворак / М. А. Даніловіч // Дыялекталогія і гісторыя беларускай мовы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 15–16 крас. 2008 г. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. ; навук. рэд. : Л. П. Кунцэвіч, Н. В. Паляшчук. – Мінск, 2008. – С. 11–16.
2. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы : у 2 ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; пад рэд. Р. І. Аванесава [і інш.]. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1963. – Ч. 1 : Карты. – 350 с.
3. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы : у 2 ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; пад рэд. Р. І. Аванесава [і інш.]. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1963. – Ч. 2 : Уступныя артыкулы, даведачныя матэрыялы і каментарыі да карт. – 971 с.
4. *Чарнякевіч, Ю. В.* Атлас гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны / Ю. В. Чарнякевіч. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 255 с.



*К. М. Чарота (Беларусь)*


# ПЕЙЗАЖНЫ ВОБРАЗ ЯК СІМВАЛ НАРОДНАЙ УСТОЙЛІВАСЦІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ВАЕННАЙ ПРОЗЕ

Распрацоўка тэмы Вялікай Айчыннай вайны перш за ўсё забяспечыла беларускай літаратуры прызнанне ў СССР і ва ўсім свеце. Невыпадкова і па сённяшні дзень гэтая тэма застаецца актуальнай.

У ваеннай прозе беларускіх пісьменнікаў прасочваецца імкненне аўтараў «выразіць галоўную думку» «праз вобраз, які наглядна, прадметна-абагульнена перадае сам характар і дух партызанскай барацьбы на тэрыторыі Беларусі» *(тут і далей пераклад з рускай і іншых моў – К. М. Чарота)* [1, с. 26]. Такая тэндэнцыя выяўлялася як у назвах твораў, так і «ў самім тэксце твораў часта сустракаліся пейзажныя, або бытавыя вобразы, якія з'яўляліся сімваламі народнай устойлівасці» [1, с. 26]. У творчасці Івана Навуменкі такім вобразам-сімвалам з'яўляецца вобраз сасны, які быў вынесены ў назвы першых двух раманаў яго партызанскай трылогіі, якую сам аўтар называў «Акупацыя» [2, с. 109], – «Сасна

пры дарозе» (1962) і «Вецер у соснах» (1967). Сасна як сімвал «абрамляе эпапею наогул». «Ёю пачынаецца і заканчваецца твор» [3, с. 205]. З маляўнічага апісання сасны пісьменнік знаёміць чытача з першым з пералічаных вышэй твораў: «Сасна расце на сухім грудку ля чыгуначнага пераезда. Тут, можна лічыць, развілка і скрыжаванне. Пясчаны шлях, насыпаны ўзбоч чыгункі, вядзе ў лес і ў мястэчка, прасёлкавая дарога – у мястэчка і ў поле. Вышэй дрэў паблізу – аж да самага лесу – няма, і сасна відаць здалёк. Купчастая, разгалістая, яна мала падобна да гонкіх сваіх сясцёр, дзе-небудзь у бары. Сонца сасне хапае. Дажджы абмываюць пыл, які садзіцца са шляху і чыгункі, краяць сухі грудок. Усе чатыры вятры гамоняць з сасной» [4, с. 3].

Сасна ў рамане Івана Якаўлевіча – гэта не проста дрэва, якое расце непадалёку ад будкі, дзе жыве галоўны герой твора Міця Птах. У першую чаргу, сасна з'яўляецца пэўнай «кропкай адліку», з якой пачынаецца твор, а таксама месцам, дзе адбываюцца значныя падзеі з жыцця герояў твора: «пад сасной, насупраць Птахавай будкі, збіраюцца школьнікі», «зборы пад сасной сталі для іх своеасаблівым развітаннем з роднымі мясцінамі і з дзяўчатамі, з якімі яны вучыліся разам» [4, с. 33–34].

Сасну неаднаразова плануюць знішчыць, але ў самы апошні момант па-розных прычынах гэтага не адбываецца. Сцяпан Птах быў першы, хто збіраўся зрэзаць яе дзеля дранкі для новай хаты. Ён прасіў свайго сына Міцю дапамагчы яму гэта зрабіць, але той адмовіўся, бо для юнака «са знішчэннем сасны як бы рвалася тое, што звязвала мінулае з сённяшнім і заўтрашнім, таксама важнае, што цяжка выказаць словамі і што жыве толькі ў пачуццях... Міця не можа ўявіць, якімі будуць без сасны пераезд, будка і поле. Яны стануць незнаёмымі, зусім не такімі, якімі прывык іх бачыць. І ёсць яшчэ другое» [4, с. 205]. Стары Птах і сам адмовіўся ад гэтай ідэі пазней: «А сасна хай стаіць. Думаеш, я хацеў губіць яе? Моцная яна, якраз у сіле. Да мяне стаяла, няхай стаіць і пасля мяне. Як перабраліся сюды, у будку, тады галіны ніжэй былі, рукой дастанеш. Калыску вешалі. Дзіця бачыць зялёнае і радуецца, смяецца» [4, с. 205].

Унтэр-афіцэр Лібке загадаў салдатам спілаваць сасну, але ізноў гэтага не адбылося. Маладыя салдаты Пэтэрле і Венігер, прысеўшы адпачыць пад ёй, адчулі, які прыемны ў спякотны летні «пад сасной цянёк, прахалода, на доле, паросшым рэдкай жорсткай травой, расколатыя чарнаватыя шышкі» [4, с. 243] і вырашылі не пілаваць яе, прыдумаўшы ў якасці апраўдання для Лібке гісторыю аб тым, што пад гэтым дрэвам спадабалася адпачываць лейтэнанту Эрліху.

Міця, у сваю чаргу, атаясамлівае гэтае дрэва з вобразам сасны з верша М. Ю. Лермантава «На поўначы дзікай стаіць адзінока…». Такая паралель падводзіць хлопца да высновы, што сэнс як верша пра сасну, так і яго сасны заключаецца ў тым, што «ўсё адолее чалавек. Адолее і будзе жыць. Ніколі не перастане марыць, змагацца за лепшыя, сонечныя дні. За прыгажосць. У гэтым аснова жыцця» [4, с. 352].

Шматлікія літаратуразнаўцы, якія даследавалі ваенную трылогію Івана Навуменкі, давалі сваю інтэрпрэтацыю значэння вобраза. На наш погляд, самую ўдалую прапанаваў В. В. Каваленка: «…пісьменнік у вобразе адзінокага дрэва на ветраных шляхах абагульняе вельмі многае: гэта перш за ўсё родная зямля, яе незайдросны ў мінулым лёс, небяспечнае становішча на ваенных еўрапейскіх раздарожжах, яе вынослівасць, укаранеласць, моц, хоць сасна не расце даўно і не дае патомства. Можна сказаць нават, што апісанне сасны пры дарозе – своеасаблівая прытча пра сціплую мужнасць чалавека і ўсяго народа» [5, с. 308.].

На працягу ўсёй партызанскай трылогіі Івана Навуменкі вобраз сасны становіцца сімвалам народнай мужнасці і трываласці. У творчасці народнага пісьменніка Беларусі «вобраз сасны як сімвал Радзімы стаў пазнавальным у айчынным літаратуразнаўстве» [4, с. 688].

Трэба адзначыць, што менавіта для беларускай літаратуры на тэму Вялікай Айчыннай вайны характэрна выкарыстоўваць «пейзажны ці бытавы вобраз у якасці сімвала: «У іншых літаратурах ён рэдкі, або не сустракаецца зусім» [1, с. 27].

Так, у ваенным апавяданні «Вялікае сэрца» (1944) Кузьмы Чорнага таксама сустракаецца падобны вобраз-сімвал народнай устойлівасці перад ворагам – гэта вобраз векавога дуба. Як і ў рамане Івана Навуменкі, аўтар пачынае знаёміць чытача са сваім творам з апісання вялікага старога дуба: «На Пархвенавым агародзе рос вялікі стары дуб. Можна сказаць, што ён узвышаўся над усёй мясцовасцю, і калі па шашы, якая праходзіла тут непадалёку, ехалі людзі, ім гэты дуб відзен быў гадзіны дзве, а вёска Галаскі ўсё яшчэ недзе скрывалася ў полі» [6, с. 397]. Векавы дуб у творы стаў важным звяном, якое звязвала паміж сабой некалькі пакаленняў сям’і галоўнага героя твора Пархвена Катлубовіча. Пасадзіў гэтае дрэва яшчэ Пархвенаў прадзед, пад ім жа забаўляўся з жалудамі і яго двухгадовы ўнук. Падчас акупацыі вёскі Галаскі менавіта дуб адыграў значную ролю ў супраціўленні фашысцкім захопнікам. Гэтае вялікае дрэва як шчыт закрыла сваім густым голлем хмызнячную граду, якой маглі ісці партызаны, не даючы нямецкім акупантам агледзець усю шырыню мясцовасці нават у бінокль. Пфайфель як прадстаўнік нямецкай улады ў мястэчку даў загад салдатам знішчыць гэтае дрэва. Таму спачатку спрабавалі дуб спілаваць, а затым і спаліць. Але пілы рваліся, а моцны дождж тушыў агонь. Апалены, без верхняга голля дуб працягваў стаяць, узвышаючыся над усёй мясцовасцю!

На старонках дакументальнай аповесці «Першым заўсёды цяжка» (1986) У. Дамашэвіча (1950–2014) і У. Сазановіча (1946–1997) у якасці сімвала выступае вобраз лесу. У творы ён адухоўлены і мае ўласнае імя – Старына. У жыцці галоўнага героя аповесці Сяргея Таўкача лес выконвае важную ролю, ён «вельмі свойскі – як свой сад, як свой дом» [7, с. 5]. Старына з’яўляецца «сакральным» месцам, бо ў цяжкія часы менавіта лес станавіўся для героя

«мудрым і разважлівым дарадцам, а часам нават доктарам» [7, с. 5]. Так і ў першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны менавіта ў лесе Сяргей бавіць увесь свой вольны час, шукаючы адказу на пытанне: як пачынаць уключацца ў барацьбу з нямецка-фашысцкімі акупантамі? Адказам на гэтае пастаўленае вайной пытанне становіцца ідэя стварэння падпольнай баявой групоўкі на тэрыторыі акупіраванага Клецкага раёна.

Старына ў аповесці становіцца сімвалам вечнай трываласці, бо ён быў на Клецкай зямлі да нараджэння галоўнага героя, пры самым лесе Сяргей нарадзіўся і вырас, пасля яго пакутлівай смерці Старына працягне сваё існаванне.

Такім чынам, пасля даследавання празаічных твораў, прысвечаных тэме Вялікай Айчыннай вайны, такіх аўтараў, як Іван Навуменка, Кузьма Чорны, Уладзімір Дамашэвіч, было ўстаноўлена, што ў некаторых з іх аўтары ў якасці сімвала народнай устойлівасці і трываласці выкарыстоўвалі пейзажны вобраз. У партызанскай трылогіі Івана Навуменкі такім вобразам-сімвалам з'яўляецца вобраз сасны, які быў вынесены ў назвы першых двух раманаў «Сасна пры дарозе» (1962), «Вецер у соснах» (1967), у аповесці «Першым заўсёды цяжка» (1986) У. Дамашэвіча (сааўтар У. Сазановіч) у якасці сімвала выступае вобраз лесу, у апавяданні «Вялікае сэрца» (1944) Кузьмы Чорнага – гэта вобраз векавога дуба. Імкненне беларускіх празаікаў выкарыстоўваць у сваіх празаічных творах вобраз-сімвал народнай устойлівасці перад ворагам, дае падставу сцвярджаць аб тэндэнцыйнасці такой з'явы ў беларускай ваеннай літаратуры.

## Літаратура


1. *Коваленко, В. А.* Общность судеб и сердец: Белорусская проза о Великой Отечественной войне в контексте русской и других литератур / В. А. Коваленко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 352 с.
2. *Навуменка, І. Я.* Збор твораў : у 10 т. / І. Я. Навуменка. – Мінск : Маст. літ., 2013–2017. – Т. 10 : П'еса, вершы, інтэрв'ю, анкеты, выступленні, водзывы на дысертацыі, некралогі, аўтабіяграфія, успаміны, дзённікавыя запісы, лісты. – 2017. – 989 с.
3. *Сіненка, Г.* Іван Навуменка : нарыс творчасці / Г. Сіненка. – Мінск : Маст. літ., 1981. – 206 с.
4. *Навуменка, І. Я.* Збор твораў : у 10 т. / І. Я. Навуменка. – Мінск : Маст. літ., 2013–2017. – Т. 5 : Сасна пры дарозе ; Вецер у соснах : раманы. – 2015. – 878 с.
5. *Каваленка, В. А.* Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В. Каваленка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 320 с.
6. *Чорны, К.* Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны. – Мінск : Маст. літ., 1972–1975. – Т. 2 : Апавяданні, 1928–1944. – 1972. – 479 с.
7. *Дамашэвіч, У. М.* Першым заўсёды цяжка : дакум. аповесць : для сярэд. і ст. шк. узросту / У. М. Дамашэвіч, У. П. Сазановіч. – Мінск : Юнацтва, 1986. – 95 с.